Стала вядома імя непаўнагадовага, асуджанага за фота перасоўвання вайсковай тэхнікі

19.07.2022



Учора хлопца асудзілі на тры гады калоніі агульнага рэжыму.

Асуджанага завуць **Піскун Павел Ігаравіч**. Учора ў Гомельскім абласным судзе яго справу разглядаў суддзя **Піскуноў**.

Паўла асудзілі за тое, што 27 лютага, 1 і 2 сакавіка 2022 года ён зняў на відэа транспартныя сродкі ваенізаваных падраздзяленняў Расеі, а потым даслаў у «Тэлеграм»-каналы, якія беларускія ўлады прызналі экстрэмісцкімі фармаваннямі.

Суд прызнаў **Паўла Піскуна** вінаватым у іншым садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці і на падставе ч. 1 арт. 361-4 КК прызначыў яму пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін 2 гады. Больш за тое – паколькі хлопец адпраўляў відэа перамяшчэння расейскай вайсковай тэхнікі неаднаразова – яго прызналі вінаватым у іншым садзейнічанні экстрэмісцкай дзейнасці, здзейсненым паўторна, і на падставе ч. 2 арт. 361-4 КК прызначылі яшчэ 3 гады.

Шляхам паглынання менш строгага пакарання больш строгім канчаткова прызначана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін 3 гады з адбываннем у папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму.

Аўтар: **Вікторыя Воўк**

Гомельская вясна

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Травень 2021

СВАБОДА СХОДАЎ

Тры гады "хатняй хіміі" — за знаходжанне на праспекце і парушэнне працы "Мінсктранса"

Дзяржабвінавачанне запрасіла два гады калоніі для палітвязня Івана Багдзевіча

Што адбывалася ў судах па адміністрацыйных справах цягам тыдня?

Ці можна трапіць у калонію, калі своечасова не зняў бчб-сняжынкі з акна? Юрыст расказвае пра змены ў Крымінальным кодэксе

СМЯРОТНАЕ ПАКАРАННЕ



Сястра асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Паўлава: "Яго хутчэй за ўсё расстралялі"

Андрэй Палуда: "Пакуль няма сістэмных зменаў, новыя прысуды і расстрэлы могуць адбыцца ў любы момант"

Вярхоўны суд не задаволіў апеляцыйную скаргу асуджанага да смяротнага пакарання Віктара Скрундзіка

Асуджаных да смерці братоў Косцевых памілавалі

ВІДЭА

БЛОГІ





ЛЕАНІД СУДАЛЕНКА

ЯК Я НЕ СТАЎ УДЗЕЛЬНІКАМ НАРОДНАГА “ХУРАЛА” ЦІ ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!



ЛАРЫСА ШЧЫРАКОВА

Як прайшла спецаперацыя ГУБАЗіК па пошуку брудных майткоў у журналісткі ці кароткая гісторыя аднага ператрусу

НАВІНЫ ПАРТНЁРАЎ

20.04.2023 Андрэй Горват з'ехаў з Беларусі. Што будзе з палацам у Нароўлі? «Новы час»

07.04.2023 Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе «Вясна»

23.03.2023 Зняў двух п'яных расейскіх вайскоўцаў – трапіў пад пераслед, але здолеў збегчы радыё «Свабода»

07.03.2023 Ксенія Луцкіна перахварэла ў калоніі на двухбаковую пнеўманію «Народная воля»

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў СВЕЦЕ

08.08.2022 Пошта ЗША спыніла адпраўленні ў Беларусь

26.07.2022 «Інфармацыя пра маё затрыманне нават мяне шакавала»: ураджэнца Гомельшчыны ўжо тры месяцы трымаюць у ІЧУ ў Расеі

23.07.2022 У Польшчы знік 18-гадовы хлопец з Калінкавічаў

14.07.2022 У Кіеве заявілі аб імавернасці ўзброеных правакацый у памежных з Украінай раёнах Гомельшчыны і Берасцейшчыны

САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ

Гомельская вясна
892 participants

Join



ПАРТНЁРЫ

Праваабарончыя сайты: Брэст Віцебск Гародня Магілёў

© 2023 Гомельская вясна

stryzhakandrej@gmail.com | sutiajnik@gmail.com